ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

# Школьная планета

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 3 (33) ЛІСТАПАД 2016**

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*









## Лістапад

*З буйных ліп і бяроз*
*Лісты валяцца.*
*Між паваляў і лоз*
*Рассыпаюцца.*
*Шапацяць, шалясцяць*
*Залацістыя,*
*Ўвысь галінкі глядзяць*
*Пусталістыя.*
*А як прыйдзе вясна —*
*Ўсё адменіцца,*
*І галінкі ізноў*
*Зазяленяцца.*

*Янка Купала*

***Фота Ірыны Маркевіч***

# Бяспека краіны – справа ўсяго жыцця

## БУЛОЙЧЫК ВАСІЛЬ МІХАЙЛАВІЧ



- ***Выпускнік 1970 года.***
- ***Доктар тэхнічных навук, прафесар, начальнік навукова-даследчага цэнтра мадэліравання ваенных дзеянняў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.***
- ***З 1995 года начальнік кафедры інфармацыйна-вылічальных сістэм Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.***
- ***У 2002 годзе абараніў доктарскую дысертацыю.***
- ***Удзельнік шматлікіх міжнародных навуковых канферэнцый.***

Адпраўной кропкай у армейскай кар'еры Васіля Міхайлавіча, які *з адзнакай скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітнае ракетнае вучылішча (МВІЗРВ) ў 1975 годзе*, стала *пасада малодшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчага і выпрабавальнага палігона Масква-400*, больш вядомага як Капусцін Яр. Маладому афіцэру выпаў гонар далучыцца да ўкаранення авіяцыйнай сістэмы навядзення знішчальнай авіяцыі «Рубеж».

— Наша праца заключалася ў даследаванні характарыстык АСК «Рубеж-2» пры рэалізацыі алгарытму навядзення аб'екта на мэту. Нягледзячы на суровыя кліматычныя і бытавыя ўмовы, служыць на палігоне было вельмі цікава. Там я ўпершыню ўбачыў і пачаў адчуваць нейкі, як кажуць сёння, драйв ад таго, як навуковыя распрацоўкі ўкараняюцца ў жыццё. Гэта былі незабыўныя моманты службы як раз з-за адчування «жывой працы», — з настальгіяй успамінае афіцэр.

Па-свойму рамантычныя і плённыя пяць гадоў палігоннай службы яшчэ раз пераканалі капітана Булойчыка Васіля Міхайлавіча ў неабходнасці пастаянна павышаць свой адукацыйны ўзровень. Заканамерным крокам у яго кар'еры стала *навучанне на факультэце кіруючага афіцэрскага складу Ваеннай інжынернай радыётэхнічнай акадэміі СПА* (горад Харкаў). Пазней Васіль Міхайлавіч *стаў адным з неменікаў дадзенай армейскай акадэміі*. У выніку яго дысертацыйных даследаванняў быў створаны высокаінтэлектуальны праграмны прадукт, які выкарыстоўвалі ў сістэме апаратуры ЦКП СПА (супрацьпаветраная абарона) СССР.

— Практычным вынікам маёй кандыдацкай дысертацыі стала *прымяненне навукова-даследчай працы «Мадэль ацэнкі эфектыўнасці баявых дзеянняў груповкі СПА» ў працы цэнтральнага каманднага пункта СПА СССР*, — адзначае Васіль Булойчык.

Тут варта патлумачыць, што Васіль Міхайлавіч *удзельнічаў у распрацоўцы праграмнага забеспячэння, у якім ажыццяўлялася мадэліраванне баявых дзеянняў і працэсы іх забеспячэння*. У цэлым спецыфіка яго навуковай дзейнасці заключалася ў распрацоўцы спецыяльных праграм.

Іншымі словамі, на падставе дадзеных, якія паступаюць ад розных крыніц аб становішчы на «тэатры ваенных дзеянняў», камп’ютарная праграма павінна была праводзіць аналіз і прадастаўляць некалькі варыянтаў развіцця падзей, што, у сваю чаргу, давала аснову для прыняцця камандзірам аптымальнага і ўзважанага рашэння ў рэжыме рэальнага часу. Падобныя сістэмы лагічна выбудаваных крокаў і сёння дапамагаюць ваенным кіраўнікам ў разы скарачаць час на прыняцце рашэння.



*У Беларусь Васіль Міхайлавіч быў пераведзены ў 1988 годзе, ён працягнуў службу і навуковую дзейнасць у сценах МВІЗРВ на пасадах выкладчыка, старшага выкладчыка, намесніка начальніка і начальніка кафедры СПА МВІЗРВ.*

*У 1995 годзе пад кіраўніцтвам палкоўніка Васіля Міхайлавіча Булойчыка ў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь ствралася кафедра «Інфармацыйна-вылічальныя сістэмы».* Афіцэр актыўна спрыяў працы па камп’ютарызацыі навучальнага працэсу ў акадэміі, стварэнні сучасных інфармацыйных адукацыйных тэхналогій і ўкараненні прагрэсіўных метадаў навучання. Пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле Васіля Міхайлавіча былі створаны навучальныя праграмы па 15 вучэбных дысцыплінах, якія выкладаюцца ў вайсковых ВНУ. Яго выхаванцы, у лік якіх сёння ўваходзяць слухачы і магістранты акадэміі, адзначаюць, што кожны матэрыял Васіль Міхайлавіч тлумачыць даходліва, з захапленнем і выключна цікава.

*А ці можа быць інакш — бо гэты чалавек з'яўляецца аўтарам больш чым дзвюх соцень навуковых і навукова-метадычных работ! Васіль Булойчык — ганаровы вучоны Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. З яго лёгкай рукі была створана навуковая школа «Сучасныя метады і сродкі матэматычнага мадэліравання баявых дзеянняў і ваенна-тэхнічных сістэм».*

Варта адзначыць, што вынікі навукова-даследчых работ Васіля Міхайлавіча сталі асновай пры стварэнні шэрагу праграмных комплексаў і матэматычных мадэляў для абгрунтавання рашэнняў, якія прымаюцца камандзірам групоўкі ВПС і войскаў СПА. Вышэй названыя комплексы матэматычных мадэляў, якія выкарыстоўваюцца ў паўсядзённай дзейнасці галоўнага аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл, штаба камандавання ВПС (ваенна-паветраныя сілы) і войскаў СПА. Іх прымяненне ў войсках накіравана на павышэнне эфектыўнасці кіравання падначаленымі сіламі і сродкамі і забяспечвае ўмацаванне абараназдольнасці Рэспублікі Беларусь.



Дасягненні творчага навуковага калектыву, які ўзначальвае Васіль Булойчык, дэманстраваліся на сямі міжнародных выставах навінак ўзбраення і ваеннай тэхнікі, заслужылі высокую ацэнку спецыялістаў і былі ўзнагароджаны ганаровымі дыпломамі.

А нядаўна Васіль Міхайлавіч Булойчык *прызначаны начальнікам навукова-даследчага цэнтра мадэліравання ваенных дзеянняў.*

***Матэрыял падрыхтавала Н. С. Міхалёва***




# Приснится же такое!

Глава II

*Когда Марина уснула, её страхи стали превращаться в реальность.*

*Вот опять наступает долгожданное утро. Мама, разбудив свою дочь, уходит на работу, а девочка, решив ещё немного поваляться в постели, уснула. Вдруг зазвонил телефон, она вскочила с постели и поняла, что проспала. Мама была в шоке от такой безответственности. Марина стала носиться по квартире, хватая на лету бутерброд и рюкзак. Надев обувь, она выскочила из дома. По пути в школу девочка встречала удивлённые взгляды прохожих, но задумываться над этим ей было некогда. И вот она новая школа, новый класс.*

*Запыхавшись, девочка остановилась перед дверью в класс, вздохнула и решительно вошла. В её сторону сразу же полетели самолётики. Раздался громкий хохот мальчишек. Сделав вид, что ничего не произошло, она прошла и села за свободную парту. Любопытство класса нарастало. Самые нетерпеливые подошли к новенькой и стали задавать разные вопросы, но прозвенел спасительный звонок.*

*Дверь открылась, и в класс вошла учительница. Все замолчали. Вдруг с задней парты кто-то выкрикнул:*

*- А у нас новенькая!*

*- Отлично, - сказала учитель математики, – Сейчас и познакомимся. Тебя зовут Марина? Выходи к доске.*

*Новенькой на миг показалось, что земля покачнулась под ногами. Она шла к доске и думала, что сейчас упадёт в обморок. Вокруг все стали шушукаться, а некоторые смеялись и показывали пальцами на её обувь. Дальше девочка уже не слышала вопросы, потому что до неё дошло: она надела вместо своих новеньких туфелек старые балетки, да ещё разного цвета. Девочка хотела крикнуть во весь голос: «Ну и что, что я надела балетки разного цвета, зато я всё знаю!». Но в её ушах прозвенели слова учителя:*

*- Садись, два.*

*Из глаз Марины брызнули слёзы, и она услышала, что её кто-то зовёт.*

*- Доча, ты дома?*

*Это пришла с работы мама. Открыв глаза, девочка поняла, что это был всего лишь сон. Она вздохнула с облегчением и побежала встречать маму. Ей хотелось скорей поделиться впечатлениями о прошедшем дне, а про то, что ей приснилось, она решила промолчать.*

***Анастасия Губич***



# Нам любыя дарагі дарогі!!!



Гісторыі працягваюцца ... І цяпер мы накіраваліся ў «Дукорскі маёнтак", былую сядзібу Ашторпаў. Туды дабрацца вельмі проста, так як "маёнтак" размяшчаецца ў 8-мі кіламетрах ад Смілавіч. Пракаціўшыся па Смілавічах (пасёлак гарадскога тыпу), у якім знаходзіцца валюшна-лямцавая (руск. валяльно-войлочная) фабрыка, сядзіба Манюшкі (у дрэнным стане), мы пакацілі далей. На тэрыторыю вядзе старадаўняя дарога, па баках абсаджаная дрэвамі. Ад сядзібы засталася ўсяго толькі малая частка (разбураная брама), яе знайшлі і адрэстаўрыравалі. Толькі зірніце на гэтую прыгажосць!



На тэрыторыі сядзібна-паркавага турыстычнага комплексу "Дукорскі маёнтак" размяшчаюцца: адрэстаўрыраваная брама, стайня, домікі розных майстроў, перавернуты дом і невялікі будынак, у якім знаходзіцца музей сядзібы Ашторпаў і сама брама. У гэтую паездку нам пашчасціла набыць кнігу-даведнік па турыстычных месцах Беларусі, дзе сабрана ўся інфармацыя (каардынаты месцаў, месцы для начлегу і многае іншае). У кузні я адчаканіла сабе 1 бульбаш (жартоўную манетку на шчасце), у ганчарні мы купілі сабе сподачак з абрысамі беларускай мяжы і з назвамі абласных цэнтраў. Прагульваючыся па тэрыторыі, мы ўбачылі, што тут можна пастраляць з пнеўматычнай зброі (мая невялікая слабасць), вынікі трохі ашаламілі тату і хлопца, які аказваў гэту паслугу, ну а я, у сваю чаргу, была шчаслівая.







У стайню я заходзіла некалькі разоў, настолькі мне спадабалася стаяць каля коней, гладзіць іх.










Ну і як не апісаць галоўную славутасць - перавернуты дом. У ім 2 паверхі: на першым адчуваеш сябе нармальна, нягледзячы на тое, што ўсё ўверх дном, але, падняўшыся на другі, цалкам змяняецца твой стан, вестыбюлярны апарат ужо не спраўляецца і крыху кружыцца галава, але разам з тым неймавернае пачуццё нейкай радасці, шчасця. Было пацешна глядзець на людзей, якія стаялі не прама, а пад вуглом. Маленькія дзеці і некаторыя дарослыя падалі і выводзілі адзін аднаго пад рукі. Яшчэ раз паўтаруся, што распавядаць бескарысна, гэта трэба бачыць. Раіць я таксама не магу, скажу толькі, што трэба ўбачыць усё, каб скласці агульную карціну пра Беларусь - такую прыгожую і нязведаную НАШУ краіну !!!

***Марыя Власюк, фота аўтара***

**Результаты первого этапа акции "Бумажный бум":**




1 место - 1 "А" класс (162 кг)
2 место - 7 "Б" класс (107 кг)
3 место - 3 "Б" класс (100 кг)
Активное участие в акции принимают 1 "Б" (81 кг), 2 "А" (63 кг), 6 "А" (63 кг) г.

**Внимание!**
**Акция продлена до 31.12.2016 г.**
**Приносите макулатуру в течение второго этапа акции и станьте победителем.**

# Што рабіць, калі на вуліцы галалёд?..

*Наступіла пара замаразкаў і адліг*, - лепшыя ўмовы для галалёду. А ён - з'ява небяспечная: траўмы, ДТЗ, пашкоджанне ліній сувязі.

Сіноптыкі гавораць, што *галалёд* - гэта пласт шчыльнага лёду, які ўтварыўся на зямлі, тратуарах, праезжай часткі вуліцы і на дрэвах з-за замярзання вады. Яму звычайна спадарожнічаюць блізкая да нуля тэмпература паветра, высокая вільготнасць, вецер. Таўшчыня лёду пры галалёдзе можа дасягаць некалькіх сантыметраў. Але галалёд - сустракаецца радзей, чым *галалёдзіца*, - лёд або пласт снегу, ўтрамбаваны да цвёрдага стану, які ўтварае слізкую паверхню. Галалёдзіца ўзнікае там, дзе перад замаразкамі стаяла вада, ці там, дзе рух транспарту або пешаходаў ўшчыльніў снег.

*Галалёд і галалёдзіца з'яўляюцца прычынамі надзвычайных сітуацый.* Пры галалёдзе значна павялічваецца колькасць вулічных траўм: удары, вывіхі і пераломы. Галалёдныя траўмы ўжо атрымалі больш за 100 чалавек, у тым ліку дзеці.

Каб не трапіць у лік пацярпелых, да неспрыяльных умоў можна падрыхтавацца: гэта простыя правілы і іх можна вывучыць з дзецьмі:

- Звярніце ўвагу на свой абутак: падбярыце абутак з падэшвай на мікрапорыстай аснове. Ад высокіх абцасаў лепш адмовіцца. Пажылым людзям рэкамендуецца выкарыстоўваць кій з гумовым наканечнікам ці адмысловую палку з завостранымі шыпамі.
- Глядзіце сабе пад ногі, старайцеся абыходзіць небяспечныя месцы. Калі ледзяную «лужыну» абыйсці немагчыма, то перасоўвайцеся па ёй, як лыжнік, невялікімі слізгальнымі крокамі.
- Старайцеся абыходзіць усе месцы з нахільнай паверхняй.
- Наступаць варта на ўсю падэшву, злёгку паслабіўшы ногі ў каленях.
- Рукі па магчымасці павінны быць вольныя, старайцеся не насіць цяжкія сумкі, не трымайце рукі ў кішэнях - гэта павялічвае верагоднасць падзення.
- Калі Вы паслізнуліся, прысядзьце, каб знізіць вышыню падзення.
- У момант падзення паспрабуйце згрупавацца, і, перакаціўшыся, змякчыць удар аб зямлю.
- Не спрабуйце выратаваць рэчы, якія несяце ў руках.
- Не спяшайцеся падняцца, агледзьце сябе, ці няма траўмаў, папрасіце прахожых людзей дапамагчы.
- Памятайце: асабліва небяспечныя падзенні на спіну, дагары тварам.
- Будзьце вельмі ўважлівымі пры пераходзе дарогі: не спяшайцеся, і тым больш не бяжыце. Абавязкова пераканайцеся, што аўтамабіль спыніўся, каб вас прапусціць.

**Інфармацыя Міністэрства надзвычайных спраў Рэспублікі Беларусь**





*Дом, у якім утульна ўсім!*

berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 32, кастрычнік 2016 г.*

## Графік правядзення Навагодніх святаў у Дзяржаўнай установе адукацыі “Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно”

| Дата | Клас | Час |
|---|---|---|
| 24.12 | Школа будучых першакласнікаў | 10.00 – 11.30 |
| 26.12 | 1 «А», 2 «А», 2 «Б», 4 «А» | 12.00 – 13.30 |
| | 1 «Б», 3 «А», 3 «Б» | 14.00 – 15.30 |
| 28.12 | 5 – 8 класы | 15.00 – 17.00 |
| 29.12 | 9 – 11 класы | 18.00 – 21.30 |

*5 “А” клас*
*Фота Надзеі Міхалёвай*



ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына